**В. Былінскі**

Сакратар Гомельскага абкома КП(б)Б

# Па-большэвіцку кіраваць прыёмам у партыю

Велізарная работа большэвіцкай партыі па разгрому і выкарчоўванню ворагаў народа, праведзеныя на аснове Сталінскай Канстытуцыі выбары ў вярхоўныя органы ўлады ўзнялі палітычную актыўнасць працоўных на нябачаную вышыню, яшчэ цясней згуртавалі іх вакол партыі Леніна—Сталіна, што знайшло сваё яркае адлюстраванне ва ўзросшым імкненні беспартыйнага актыва ў рады ВКП(б).

Рад партыйных арганізацый Гомельскай вобласці палепшыў палітычную работу сярод шырокіх мас працоўных і дабіўся некаторых поспехаў у выкананні рашэння ЦК ВКП(б) ад 29 верасня 1936 года «Аб аднаўленні прыёму новых членаў у ВКП(б)».

Калі ў мінулым годзе па вобласці было прынята ў партыю 96 чалавек, то за 8 месяцаў гэтага года прынята ўжо 540 чалавек у кандыдаты і 237 у члены партыі. Акрамя таго, адноўлена ў кандыдаты і члены партыі 404 чал.

Добрушская партарганізацыя ў члены і кандыдаты партыі прыняла 44, Рэчыцкая—86, Жлобінская—55, Рагачоўская—94, Веткаўская—44 і Чачэрская—38 чалавек.

Выбары ў Вярхоўны Совет БССР далі тысячы новых актывістаў, якія працавалі агітатарамі на выбарчых участках. Несучы ў масы большэвіцкае слова, агітуючы за кандыдатаў непераможнага блока комуністаў і беспартыйных, гэтыя таварышы паказалі сваю бязмежную адданасць справе Леніна—Сталіна і зараз становяцца рэзервам, з якога папаўняюцца рады нашай партыі. Яны падаюць заявы аб прыёме ў кандыдаты, аб пераводзе з кандыдатаў у члены партыі.

Жлобінскі райком партыі прыняў у кандыдаты агітатараў выбарчай кампаніі тт. Катляра, Гайдука, Прозарава, Эрэнбурга.

Рэчыцкі райком прыняў у кандыдаты партыі агітатара выбарчага ўчастка старшыню калгаса імя Свердлова тав. Дворніка, брыгадзіра трактарнай брыгады тав. Дубавец, старшыню Падалескага сельсовета дэмабілізаванага чырвонаармейца тав. Бандарэнка.

У партыю прынят Чачэрскай партарганізацыяй старшыня самага вялікага ў раёне калгаса тав. Семкаў. Гэты таварыш добра спраўляецца з работай і многа працуе над сабой. Ён акуратна рыхтуецца да заняткаў, чытае мастацкую літаратуру, праводзіць гутаркі з калгаснікамі.

Кандыдаты партыі тт. Гурскі і Раманцоў рыхтуюцца да ўступлення ў члены партыі. Яны добрасумленна выконваюць усе партыйныя даручэнні, складаюць канспекты да заняткаў і прыходзяць на вучобу заўсёды падрыхтаванымі.

Гомельскі, Веткаўскі, Лоеўскі і Рагачоўскі райкомы прынялі ў кандыдаты партыі дэпутатаў Вярхоўнага Совета БССР тт. Баравікова, Ганчарэва і Стасенка, намесніка старшыні Вярхоўнага Совета БССР тав. Барушкова, дэпутата Вярхоўнага Совета СССР тав. Мінаву. Рагачоўскі райком прыняў у партыю стаханаўцаў картоннай фабрыкі тав. Стральцова Х., стаханаўца лесазавода імя Халтурына тав. Гардзіеўскага. Партыйныя арганізацыі лесазавода імя Халтурына, картоннай фабрыкі, Забалоцкага, Азяранскага і іншых сельсоветаў значна папоўніліся лепшымі, праверанымі людзьмі. За палову бягучага года па раёну прыняты ў партыю 34 камсамольцы. Веткаўскі райком партыі прыняў у кандыдаты 50-гадовую калгасніцу Самонаву Еву Пятроўну, якая 4 гады працуе членам прэзідыума сельсовета і 7 год—членам праўлення калгаса. У кандыдаты партыі прынят 50-гадовы калгаснік Літвінаў Барыс Сямёнавіч.

**З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы**